ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.16 (3376) ● ЧАЦВЕР, 24 КРАСАВІКА, 2014

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY

З імгненняў складваюцца лёсы
Беларуска Раіса Бушук трапіла ў фотагалерэю прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў Эстоніі Стар. 2



Рэха далёкай вайны
У Нацыянальнай бібліятэцы прэзентаваўся культурна-асветніцкі праект “Драма Першай сусветнай” Стар. 3

Момант шчасця
“Не ўкрадзі” — гэта значыць і не прысвойвай чужога Стар. 4

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

“Кліч” з Малдовы

У Кішынёве прайшла ўстаноўчая канферэнцыя новага беларускага грамадскага руху

Кіраўнік праўлення руху “Кліч” Ганна Мазур (справа) і яе сяброўка-намесніца Іна Афценіе

Маю вялікі гонар, шчасце і радасць падзяліцца з чытачамі “Голасу Радзімы” выдатнай навіной ад беларускай дыяспары ў Малдове: у нас ёсць новая суполка “Кліч”!

Для чаго спатрэбілася пашыраць інфраструктуру дыяспары? Бо нас шмат — дзесяць гадоў таму пад час перапісу ў Малдове зафіксавана каля 6 тысяч беларусаў. У краіне было 8, а цяпер 9 беларускіх суполак, але да апошняга часу толькі “Беларуская грамада ў Рэспубліцы Малдова” мела рэспубліканскі статус. І вось 30 сакавіка ў Кішынёве, у Бюро міжэтнічных адносін прайшла ўстаноўчая канферэнцыя грамадскага аб’яднання “Беларускі культурны рух Рэспублікі Малдова “Кліч”, скарочана: БКРРМ “Кліч”. Ідэю я выношвала з сябрамі.

Блаславілі нараджэнне новай суполкі шмат хто. У канферэнцыі прынялі ўдзел Часовы Паверaны ў справах Беларусі ў Малдове Аляксандр Салаўёў, старшыня Беларускай грамады Юрый Статкевіч, старшыня Асацыяцыі беларусаў муніцыпія Кішынёў “Беларусь” Генадзь Зяньковіч, вядомы беларускі мастак Вячаслаў Ігнаценка, народная артыстка Малдовы з беларускімі родавымі каранямі Маргарэта Івануш, прадстаўнікі грамадскасці Малдовы — было больш за 60 чалавек. Гаварылі пра сучасны стан, перспектывы развіцця беларускай дыяспары ў Малдове. Робячы даклад, я падкрэсліла: у сучасным грамадстве поліэтнічнасць і мультыкультурнасць — гэта ўжо норма. Беларусы жывуць на малдаўскай зямлі больш за паўтысячы гадоў, суродзічы зрабілі тут шмат карыснага і добрага. А як адаптуемся ў мясцовае культурнае асяроддзе? На жаль, ідзе хуткая асіміляцыя, у другім-трэцім пакаленні беларускасці ўжо няма — на тое шмат прычын. Маючы 10-гадовы досвед сацыяльна актыўнай беларускі, я казала пра амаль поўную адсутнасць беларускамоўнага асяроддзя. А гэта ж галоўны фактар захавання беларускай нацыі ў замежжы! Пачуць родную мову, пагутарыць на ёй у Кішынёве — знак велізарнага шанцавання. У Малдове няма ніводнай установы, нават курсаў, дзе можна было б якасна вывучаць беларускую мову...

Мяркую, і моўна-адукацыйнымі праблемамі паспрабуе займацца “Кліч”, пад час прэзентацыі якога мы, улічваючы этнакультурную скіраванасць суполкі, выкарыстоўвалі і беларускі арнамент. Менавіта на культурным полі збіраемся працаваць, бо культура была, ёсць і будзе найлепшым сродкам гарманізацыі міжнацыянальных зносін. Рух “Кліч” мы бачым формай нацыянальна-культурнага самавызначэння. → Стар. 3

ВЕСТКІ

Сяброў вітала Астана

Рыгор Арэшка

Лепшыя творчыя калектывы выступалі пад час Дзён культуры Беларусі ў Казахстане

Галоўная ўрачыстасць ладзілася ў Кангрэс-холе Астаны. “Мы ідзем разам у нашым супрацоўніцтве, і не толькі ў культуры. Аснова для гэтага ёсць: сяброўства лідараў краін Аляксандра Лукашэнкі і Нурсултана Назарбаева. Прыклад дружбы мы ўвасабляем у жыццё і ў сферы культуры”, — сказаў на адкрыцці дзён Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў.

Міністр культуры Казахстана Арыстанбек Мухамедзіулы нагадаў, што у 2013-м з поспехам прайшлі Дні культуры Казахстана ў Беларусі.

На гэты раз перад гасцямі і жыхарамі Астаны выступілі Беларускі дзяржаўны ансамбль “Песняры”, вядомы ў многіх краінах свету харэаграфічны калектыў “Харошкі”, народныя артысты Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, заслужаны артыст краіны Аляксандр Крамко.

Аматары мастацтва змаглі ўбачыць фотавыставу “Беларусь сёння” з калекцыі Беларускага тэлеграфнага агенцтва.

Надоўга запомняцца гэтыя Дні культуры Беларусі ў Казахстане і нашаму суродзічу з Астаны Дзмітрыю Астаньковічу: ва ўрачыстай абстаноўцы яму быў уручаны членскі білет Беларускага саюза кампазітараў.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Ад Самары да Брэста і Мінска

Дэлегацыя школьнікаў і настаўнікаў з Паволжа не выпадкова выправілася ў далёкую вандроўку

Мікалай Бойка

Сёлетнія 70-я ўгодкі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адзначаюць не толькі ў нашай краіне. Далучыліся да святочных імпрэз і суайчыннікі з Паволжа. “На Самарскай зямлі памятаюць: Беларусь вызвалялі, за яе гінулі тысячы савецкіх воінаў розных нацыянальнасцяў, — гаворыць прэзідэнт суполкі “Руска-Беларускае Братэрства 2000” Ірына Глуская. — Сумесна з кіраўніком аддзялення “Уфа” Пасольства Беларусі ў Расіі Васілём Новакам рыхтуем спісы ветэранаў-удзельнікаў вызвалення Беларусі. Бліжэй да свята ўрачыста ўручым ім юбілейны медаль “70 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”. Пра подзвіг дзядоў памятае і маладое пакаленне. Таму педагогі, вучні 82-й школы, якая шмат гадоў супрацоўнічае з нашай суполкай, на вясновых канікул вырашылі наведаць Беларусь. Відаць, наша любоў да Бацькаўшчыны ім перадалася”.

Усіх было 30, з іх 17 — вучні 6-8 класаў, з імі настаўніцы Людміла Каральковай і Вольга Чуйкова. Вандроўнікі спачатку наведалі Брэст, Белавежскую пушчу, а ў ёй — рэзідэнцыю беларускага Дзеда Мароза. Усіх уразілі мемарыяльныя комплексы “Брэсцкая крэпасць-герой” і “Хатынь”. Мемарыял спаленых вёсак вельмі ўразіў сямікласніка Марка Іванца. Анастасіі Філімонавай спадабаліся добрыя беларускія дарогі і завядзёнка, што вадзіцелі аўто прапускаюць пешаходаў на пераходах. Экскурсіі для Насці ўсе былі вельмі цікавымі, але найбольш уражанняў ад Хатыні, Нясвіжскага замка. Зрэшты, яна яшчэ не раз плануе прыехаць сюды. Святлана Касалапава будзе згадваць, што ў Беларусі прыгожа, чыста і шмат усяго цікавага. Найбольш уразіла яе Хатынь, спадабаўся Мінск.

МІКАЛАЙ БОЙКА

Для гасцей з Самары грае школьны ансамбль “Элегія” з Мінска

У самарцаў была аглядная экскурсія па сталіцы. Верхні горад, плошча Свабоды, дзе побач шмат архітэктурных помнікаў… На плошчы Незалежнасці агледзелі касцёл святых Сымона і Алены, пабачылі Дом Урада, пахадзілі па гандлёвым цэнтры “Сталіца”. → Стар. 2

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Ад Самары да Брэста і Мінска

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Многа эмоцый выклікаў шматфункцыянальны комплекс "Мінск-Арэна", дзе ўжо хутка будуць праходзіць гульні чэмпіянату свету па хакеі. Гасцям паказалі і Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

Запомніцца, аднак, Беларусь самарскім школьнікам не толькі экскурсіямі. Дарослыя паклапаціліся, каб яны наладзілі кантакты з мінскімі аднагодкамі. Выбралі ў творчыя партнёры 77-ю школу з музычна-харавым і харэаграфічным ухілам. Так склаліся абставіны, што я, кіраўнік прэс-службы самарскай беларускай суполкі, таксама быў у Мінску, спрыяў таму, каб адбылася першая сустрэча мінскіх педагогаў з самарскімі. Ганаруся, што мінчане спрацавалі выдатна. І за тое вялікі дзякуй дырэктару школы Алене Рыбалтоўскай і яе намесніцы Таццяне Емяльянавай: усё атрымалася! Спецыяльна для гасцей зладзілі нават міні-канцэрт школьнага ўзорнага ансамбля скрыпачоў і віяланчэлістаў "Элегія" — хоць і былі канікулы.

Вядома ж, нам цікава было больш даведацца пра адметны гурт. " У складзе ансамбля 15 чалавек, у рэпертуары — творы розных стыляў і жанраў, класічная і сучасная музыка", — расказала кіраўнік гурта Жанна Бялова. Музыканты віртуозна гралі твор Ігара Лучанка "Родны кут", мелодыя тая дала новае жыццё знакамітым радкам Якуба Коласа: "Мой родны кут, як ты мне мілы…" А мелодыю "Бацькаўшчына мая" напісала кампазітар Ларыса Мурашка на словы Уладзіміра Караткевіча.

Музыка ў гэтай школе гучыць і на канікулах, і такая атмасфера вабіць яркіх, працавітых музыкаў. Акрамя вучобы, яны могуць праявіць сябе і ў творчасці. Многія выпускнікі ўжо сталі прыкладам для сённяшніх вучняў. Спявачка Кацярына Семянчук — салістка Марыінскага тэатра (Санкт-Пецярбург). Гэта, дарэчы, пра яе газета "Коммерсантъ" пісала, што "госпожа Семенчук сегодня обладает не меньшим потенциалом, чем та же Елена Образцова". Святлана Мацыеўская стала салісткай Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, Кацярына Валавік — вядучая на тэлеканале АНТ, Аляксандр Казакевіч — дырэктар 21-й гімназіі Мінска… Думаю, самарскім і мінскім школьнікам будзе цікава сябраваць, бо творчы патэнцыял 82-й самарскай школы таксама велізарны. На яе базе нашы суайчыннікі праводзяць значныя імпрэзы, у тым ліку абласныя дзіцячыя фестывалі мастацтваў "Адзінства" і "Беларусь — мая песня", у якіх удзельнічаюць і вучні школы. "Сябраваць з творчымі людзьмі нам вельмі цікава, і мы вельмі рады, што можам наладзіць партнёрскія стасункі, — гаварыла Алена Рыбалтоўская. — Гэта будзе на карысць школьнікам дыяспрыяе ўмацаванню дружбы паміж народамі".

Кіраўнік групы, настаўніца біялогіі і хіміі з Самары Людміла Каралькова пад час сустрэчы казала, што хоць такая вандроўка ў Беларусь ладзіцца ўпершыню, аднак дзякуючы партнёрству з самарскімі беларусамі ў школе ўжо шмат ведаюць пра братнюю краіну. "Нашым вучням вельмі спадабаліся беларускія гарады і людзі, якія ў іх жывуць, мы атрымалі масу станоўчых эмоцый, — адзначыла яна. — Упэўнена: дружба паміж самарскімі і мінскімі школьнікамі будзе мацнець, і гэта — вельмі важна для таго, каб нашы вучні гарманічна развіваліся, рэалізоўвалі таленты".

Знаёмства адбылося! А творчае, актыўнае супрацоўніцтва, спадзяюся, наперадзе.

МІКАЛАЙ БОЙКА

Самарцаў гасцінна прымалі ў Белавежскай пушчы, у рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

З імгненняў складваюцца лёсы

Беларуска Раіса Бушук трапіла ў фотагалерэю прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў Эстоніі. А можна ж і дзясяткі іншых суайчыннікаў сфатаграфаваць — як знак беларускай прысутнасці ў свеце.

Рыгор Арэшка

Актывістка суполкі "Сябры" з Нарвы Людміла Аннус паведаміла ў рэдакцыю пра цікавы праект. На пачатку месяца ў вежы Нарвскага замка, які цяпер працуе як гарадскі музей, адкрылася чацвёртая ўжо выстава вялікага праекта "Інтэграцыя ў фотаздымках". На вернісажы пабывалі беларускі горада. З цікавасцю разглядалі ўсе здымкі, а найбольш увагі было да выявы медсястры-беларускі Раісы Бушук.

Увогуле ж ідэя праекта такая: пры дапамозе адметных партрэтных фотаздымкаў расказаць, як інтэграваліся, уліліся ў эстонскае грамадства прадстаўнікі каля 170 розных нацыянальнасцяў. На чарговай выставе экспануецца 30 здымкаў украінкі Алены Каўпак. "Гэтыя людзі, як і мы, беларусы, не карэнныя жыхары Эстоніі, — паведамляе Людміла Аннус. — Аднак за тымі імгненнямі, што прадстаўлены гледачам, ёсць трыццаць лёсаў. І кожны — гэта адметны "шлях інтэграцыі". А мы ж ведаем, як няпроста "пусціць карані" ў іншай глебе. Кожны з нас удалечыні ад Радзімы пераадольвае цяжкасці, імкнецца знайсці жыццёвую апору, каб не згінуць бясследна, знаходзіць сяброў, стварае сям'ю. Цікавы праект! Аўтару ўдалося маляўніча адлюстраваць 30 імгненняў жыцця неэстонцаў на эстонскай зямлі".

Выставу ў замку адкрывалі прадстаўніцы розных народаў: супрацоўніца музея Таццяна Кліміна, кіраўнік праекта "Інтэграцыя ў фотаздымках" Валянціна Афанасьева, старшыня беларускага культурнага таварыства "Лёс" з Таліна Таццяна Ніжнік і фотамайстар Алена Каўпак. На вернісажы пабывалі як прадстаўнікі беларускага таварыства "Сябры", так і Украінскага земляцтва Нарвы.

Вось і падумалася: а чаму б і ў беларускіх суполках замежжа не зрабіць нешта падобнае! У розных краінах жывуць настаўнікі і касманаўты, вучоныя і генералы, прадпрымальнікі, журналісты, артысты і прадстаўнікі іншых прафесій з беларускімі родавымі каранямі. У тым ліку і ветэраны вайны і працы. Вельмі цікавыя здымкі можна зрабіць, падышоўшы да справы творча: з добрым густам і сучаснай фотатэхнікай. А рэдакцыя гатова падтрымаць праект "Імгненне і лёс" і тых, хто возьмецца ствараць фотагалерэю беларусаў замежжа. Нешта атрымаецца — рабіце выставы ў сябе, знойдзецца месца і ў Беларусі. Дасылайце лепшыя якасныя фотапартрэты на электронны адрас рэдакцыі ў лічбавым фармаце — абавязкова з невялічкімі тэкставымі анатацыямі. Вітаюцца здымкі высокаякасныя, арыгінальныя па задуме і кампазіцыі, а не бяздумныя імгненныя "пстрычкі" з мабільнікаў. На гісторыю ж працуем…

ЛЮДМІЛА АННУС

Беларуска з Таліна Таццяна Ніжнік прэзентуе фотавыставу ў Нарве

ВЕСТКІ

Дружбе межы не патрэбныя

Алесь Карлюкевіч

Часопіс "Вясёлка" разам з выдавецтвам "Адукацыя і выхаванне" распачаў кніжны праект "Бібліятэка часопіса "Вясёлка". У прасторы бібліятэкі выдаецца серыя "Нашы замежныя сябры".

Першай кніжкай-ластаўкай згаданай серыі стаў зборнік вершаў і казак літоўскага паэта Вітаўтаса Бараўскаса "Зіхаціць на небе сонца". Пра тое, як нарадзілася ідэя выдаць менавіта гэтую кнігу, расказвае галоўны рэдактар "Вясёлкі" Уладзімір Ліпскі: "Мы з Вітаўтасам Бараўскасам даўнія сябры. У асобе дзіцячага пісьменніка, шматгадовага галоўнага рэдактара часопіса для дзяцей Літвы і я, і калектыў "Вясёлкі" маем добрага, сапраўднага сябра. І сяброўству нашаму ніякія межы не перашкода. Вітаўтас — з шматдзетнай сям'і. Яго браты Альбертас і Стасіс пачыналі партызанскую біяграфію поруч з беларускімі лясными мсціўцамі, ваявалі рука аб руку з Пятром Машэравым. Стасіс загінуў, а другі брат, Альбертас, стаў вядомым партызанскім камандзірам. Вітаўтас піша песні для дарослых і дзяцей. Аб'ехаў ці не ўвесь свет, мае сяброў у розных краінах. Акрамя напісання кніг для дзяцей, запісвае і выдае афарызмы. Адзін з іх гучыць так: "Любоў нараджаецца ў сэрцы — і загінуць можа толькі разам з сэрцам".

Пераклалі вершы і казкі Вітаўтаса Бараўскаса на беларускую мову Васіль Вітка (тыя пераклады друкаваліся шмат гадоў таму ў часопісе "Вясёлка"), Алесь Гібок-Гібкоўскі, Анатоль Грачанікаў, Павел Марціновіч, Мікола Маляўка, Мікола Чарняўскі.

Серыя "Нашы замежныя сябры", несумненна, будзе мець працяг. Бо і ў часопісе "Вясёлка", і ў іншых дзіцячых перыядычных выданнях Беларусі друкуецца нямала твораў паэтаў і празаікаў іншых краін.

Дыханне зямлі

У Кішынёве адкрылася персанальная выстава Вячаслава Ігнаценкі

Новы праект мастака-беларуса "Дыханне зямлі" ўпершыню рэалізаваны ў будынку пасольства Венгрыі ў Малдове. Гэта ўжо 37-я па ліку персанальная выстава майстра.

Больш падрабязна пра падзею чытайце ў бліжэйшы час.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

“Кліч” з Малдовы

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Шукаючы назву сваёй суполцы, спыніліся менавіта на такой, бо кліч — гэта словы, гукі, якія выказваюць просьбу прыйсці, адгукнуцца. Увогуле — назва ёмкая і шматзначная. Мы маем намер спалучыць традыцыйныя рысы дзейнасці этнасуполак з новымі ініцыятывамі, надаць больш энергіі, дынамікі беларускай культуры ў Малдове.

Рух задуманы для ўсіх, хто адносіць сябе да нашага этнасу ці праяўляе цікавасць да беларускай культуры. Мы ставім на мэце захаванне, вывучэнне, развіццё і пашырэнне беларускай культуры, мовы, гісторыі, традыцый, звычаяў, а таксама нацыянальнай і этнакультурнай самабытнасці, духоўных і маральных каштоўнасцяў беларусаў. Задумваем праекты, скіраваныя на дыялог культур беларускага і малдаўскага народаў. Будзем усяляк спрыяць умацаванню дружалюбных адносін як паміж беларускімі суполкамі свету, так і паміж Малдовай і Беларуссю. Мы перакананыя, што актыўная беларуская прысутнасць ідзе на карысць нашаму народу, росквіту Беларусі, таму будзем развіваць сацыяльныя інстытуты дыяспары. Заявілі мы на канферэнцыі, што будзем актыўна спрыяць наладжванню міжкультурнага дыялогу, паразумення, супрацоўніцтва і сяброўскіх адносін паміж беларускай дыяспарай і прадстаўнікамі іншых этнасаў і нацыянальных супольнасцяў Малдовы і замежжа.

Момант творчасці: Альбіна Анфінагенава і Арына Афценіе

Як успрынялі нашы амбіцыйныя заявы тыя, хто прыйшоў на канферэнцыю? Аляксандр Салаўёў прывітаў ініцыятыву, паабяцаў “Клічу” дапамогу і падтрымку. Кіраўнікі беларускіх суполак Юрый Статкевіч і Генадзь Зяньковіч — таксама на нашым баку. На канферэнцыі зацверджаны статут, выбрана праўленне руху “Кліч”, якое мне даверылі ўзначаліць.

Цёплую, сяброўскую атмасферу ў зале падтрымлівала і прысутнасць дзяцей, моладзі. Яны ўдзельнічалі ў конкурсе “Вясновы Кліч”: на вялікіх аркушах паперы, пакуль дарослыя працавалі, увасаблялі свае асацыяцыі на гэтую тэму.

Па заканчэнні афіцыйнай часткі гэткай “беларускай вішанькай” на святочным торце стаў інтэрактыўны спектакль “Вясновы Кліч”. Увесь — па-беларуску, паводле абрада “Туканне Вясны”, хоць рыхтавалі яго дзеці і моладзь беларускага, малдаўскага, рускага, украінскага і румынскага паходжання. З вялікім імпэтам пазбавіліся ўсе ў фінале ад бога зімы-Зюзі і яго сястрыцы-Завірухі. А прыгажуня Ляля, багіня вясны, з’явілася дзякуючы гукальшчыкам і спеву жаўрука — спрадвечна першаму вясновому клічу.

Што ж, “Кліч” ёсць. А далей — толькі самі беларусы, што жывуць на зямлі Малдовы, могуць надаць яму сілы. Толькі нашае жаданне не згубіцца, не “растварыцца”, заставацца самімі сабой будзе клікаць нас да дзеянняў, каб захаваць, умацаваць, памножыць ды нашчадкам перадаць усё тое, што нам у спадчыну перадалі продкі, наша родная любімая беларуская Маці-Зямля!

Ганна Мазур, кіраўнік праўлення руху “Кліч”, Малдова

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Рэха далёкай вайны

У Нацыянальнай бібліятэцы прэзентаваўся культурна-асветніцкі праект “Драма Першай сусветнай”

Людміла Малей

Праект прысвечаны 100-м угодкам з пачатку Першай сусветнай вайны — першай ў гісторыі, якая сабрала каласальныя ахвяры. Загінула каля дзесяці мільёнаў чалавек, было паранена больш за дваццаць і каля дзесяці памерла ад эпідэмій і голаду. Тэрыторыя Беларусі на самым пачатку вайны стала арэнай жорсткіх баёў, месцам, дзе вырашаўся лёс Еўропы і ўсяго чалавецтва.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі высока ацаніў праект, які дае магчымасць атрымаць урокі з трагічных падзей, пазнаёміцца з дакументамі, паглядзець на вайну вачыма сведак, успомніць і ўшанаваць памяць тых, хто ваяваў, пакутаваў на той вайне. Старшыня праўлення дабрачыннага культурна-гістарычнага фонду памяці Першай сусветнай вайны “Крокі”, тэлевядучы Вячаслаў Бандарэнка казаў, што любоў і павага да воінаў-абаронцаў роднай зямлі назаўжды павінна застацца ў гістарычнай памяці народа. Ён перадаў бібліятэцы два дзіцячыя выданні пра тую вайну.

Частка праекта — гэта кніжная выстава. На ёй каля 500 навуковых і навукова-папулярных выданняў з фонду бібліятэкі, прысвечаных вайне. Можна пагартаць кнігі аб яе перадгісторыі, унутранай і знешняй палітыцы краін, пачатку і ходзе ваенных дзеянняў, зброі і тэхніцы, значных бітвах. Прэзентаваліся розныя кнігі. Выданне Валянціны Бялявінай “Беларусь в годы Первой мировой войны” ўтрымлівае вялікую колькасць архіўных фотаздымкаў, музейных матэрыялаў, успамінаў сведак трагедыі. Аўтар — старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. А ў зборніку Нацыянальнага гістарычнага архіва “Беларусь в годы Первой мировой войны. Документы” больш за 200 дакументаў. Дырэктар архіва Дзмітрый Яцэвіч і вядучы навуковы супрацоўнік Міхаіл Крывіцкі расказалі, як ішла праца.

У праекце прадстаўлены і арыгінальныя паштоўкі з калекцыі вядомага філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава. Аўтар расказаў пра калекцыю, кнігу з серыі “У пошуках страчанага” пад назвай “Беларусь праз фотааб’ектыў нямецкага салдата. 1915—1918”. Асобнікі выдання аўтар уручыў Раману Матульскаму і Паслу Германіі ў Беларусі Вальфраму Маасу. Даўнія фотаздымкі — нямыя сведчанні пра той час, унікальныя дакументы, якія дазваляюць паглядзець праз стагоддзе на моманты баявых дзеянняў, будні лазарэтаў, архітэктуру, жыццё і побыт мясцовага насельніцтва.

На тэрыторыі Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцей амаль паўсюль сустракаюцца брацкія могілкі воінаў Першай сусветнай вайны. Пахаванні ў лясах і па берагах рэк, на ўскраінах вёсак і гарадоў чакаюць свайго часу, калі памяць людская падыме з нябыту імёны герояў, ушануе іх за подзвіг. Намеснік старшыні праўлення фонду “Крокі”, заслужаны мастак БССР Барыс Цітовіч прыйшоў на імпрэзу з жонкай Валянцінай. Яны 40 гадоў аднаўляюць памяць пра воінаў і падзеі мінулага. У вёсцы Забродзе на Вілейшчыне Цітовічы на свае грошы збудавалі капліцу-помнік, там ёсць адзіны на ўсёй постсавецкай прасторы музей Першай сусветнай вайны. Адноўлены лазарэтныя могілкі, ва ўсіх значных месцах пастаўлены знакі і памінальныя камяні. Мясцовасць набыла выгляд мемарыяльнага комплексу, які штогод наведваюць тысячы людзей, каб аддаць даніну памяці героям, што баранілі Айчыну ў той вайне. Мастак прэзентаваў карціну, прысвечаную Першай сусветнай, у аснове сюжэта — рэальныя падзеі. У рабоце скарыстаны сапраўдныя асколкі, кавалкі калючага дроту.

Франтавы фотаздымак часоў Першай сусветнай вайны

Культурна-асветніцкі праект “Драма Першай сусветнай” цяпер запатрабаваны. Даследаванні мінулага — гэта даніна памяці героям, павага да гісторыі ўласнага народа, у якой яшчэ нямала “белых плямаў”. Аднаўляюцца помнікі і воінскія пахаванні, устанаўліваюцца імёны загінулых. 14 жніўня 2011 года на месцы Мінскіх брацкіх могілак адкрыты мемарыял, прысвечаны воінам Першай сусветнай вайны. Для захавання гістарычнай пераемнасці пакаленняў краіне, гаварылі ўдзельнікі праекта, патрэбен і дзяржаўны музей. Бо святы абавязак нашчадкаў — ведаць па імёнах і прозвішчах сваіх герояў і абаронцаў, шанаваць іх памяць.

СПАДЧЫНА

Талака ў Грушаўцы

Дружна працавалі энтузіясты на тэрыторыі багатай на гісторыю сядзібы ў Ляхавіцкім раёне

Супольнай працай на тэрыторыі сядзібы Рэйтанаў у Грушаўцы адзначыла наша арт-суполка першую гадавіну дзейнасці. Згадвалі мы і 241-ю гадавіну пачатку Надзвычайнага сойму 1773 года: менавіта ён, як вядома, вывеў на першыя ролі ў вялікай драме аслабленай Рэчы Паспалітай Тадэвуша Рэйтана, шляхціца і гаспадара Грушаўкі. І вось родавае котлішча Рэйтанаў у чарговы раз стала месцам сустрэчы людзей, неабыякавых да беларускай гісторыі. Наша арт-суполка працавала на сядзібе і летась, а сёлета далучыліся супрацоўнікі газеты “Культура”, вядомы тэлевядучы праграмы “Вандроўкі дылетанта” Юры Жыгамонт, дырэктар Баранавіцкай мастацкай школы Анатоль Лабкоўскі, іншыя творчыя людзі. Мастак Алесь Родзін прадставіў у Грушаўцы некалькі буйных графічных прац з серыі, прысвечанай роду Рэйтанаў.

Сабралася нас амаль 20 чалавек. Ды мушу прызнаць: на шчасце Грушаўцы, большасць працы зрабілі жыхары Ляхавіччыны. Падзея, можна сказаць, лёсавызначальная: новае кіраўніцтва раёна пастанавіла, што святое для беларусаў месца павінна мець належны выгляд. “Цудоўна папрацавалі! — казаў Юры Жыгамонт. — З Грушаўкі мы ўжо рабілі тэлеперадачы. На гэты раз асабліва ўразіла: прадстаўнікі ўлады паказалі, дзе варта прыкладваць сілы”. На працу выйшла каля сотні чалавек ад розных прадпрыемстваў, устаноў Ляхавіч, кіраўніцтва раёна. “Старшыні райвыканкама Вячаслаў Сельмановіч і райсавета дэпутатаў Яўген Юрлевіч разам з работнікамі райвыканкама добраўпарадкавалі тэрыторыю палацава-паркавага ансамбля “Грушаўка,” — напісала райгазета “Ляхавіцкі веснік”, падаўшы ў інтэрнэт-версіі шэраг цікавых здымкаў Сяргея Варановіча. Як вядома, шануючы герояў Айчыны з розных эпох, мы лепш усведамляем гісторыю Бацькаўшчыны, якой можам ганарыцца. Удзельнікі Грушаўскай талакі праз гады будуць ганарыцца, што прыклалі рукі да адраджэння сядзібы.

То было відовішча, вартае пэндзляў лепшых мастакоў: мужчыны з бензапіламі ачышчалі тэрыторыю ад зараснікаў, шугала полымя вогнішчаў — спальвалі галлё і смецце, выграбалі старое лісце жанчыны, прыводзілася ў парадак агароджа… Мы, творчыя людзі, не з такім размахам працавалі — прыбіралі смецце, устанавілі інфашыльду. Часам спыняліся, каб паразважаць пра непаўторнае вясновае Грушаўскае Імгненне і Вечнасць…

Мы маем намер стварыць у Грушаўцы Культурны цэнтр: займацца аднаўленнем сядзібы, праводзіць фэсты, сустрэчы мастакоў, паэтаў, музыкаў. Не так даўно на падставе архіўных дакументаў мы вызначылі дату нараджэння Тадэвуша Рэйтана: кастрычнік-лістапад 1740 года. І ў 2015-м, такім чынам, яго 275-я ўгодкі. Будзем адзначаць! Запрашаем далучацца мастакоў, музыкаў, літаратараў і ўсіх зацікаўленых.

Зьміцер Юркевіч, арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана

ТРАДЫЦЫІ

Радасць ад сапоцкінскіх майстрых

Мастацтва роспісу велікодных яек перадаецца з пакалення ў пакаленне

Юлія Букель

Вялікдзень немагчыма ўявіць без расфарбаваных яек: чырвоных, жоўтых, сініх ды іншых колераў і адценняў. А ў пасёлку Сапоцкін, што на Гродзеншчыне, яйкі не проста фарбуюць, а распісваюць. І тады яны ўжо называюцца: пісанкі. Традыцыя роспісу перадаецца з пакалення ў пакаленне. "Мяне навучыла маці, яе — бабуля, а я — сваіх дзяцей і ўнукаў вучу", — расказвае майстрыха Антаніна Юрчэня.

Дэкор яна робіць "шпількай": палачкай з цвіком на канцы. Галоўку "шпількі" апускае ў расплаўлены воск і наносіць узоры: кропкавыя, сюжэтныя, раслінныя. "Мода такая прыйшла з Польшы, — расказвае Антаніна Лук'янаўна. — Рамонкі, дзьмухаўцы, лісточкі — гэта ўзоры, якія малявалі з даўніх часоў". Часты матыў сапоцкінскіх майстрых — круг-разетка па цэнтры яйка, а вакол паўразеткі, кропкі, ланцужкі.

ЮЛІЯ БУКЕЛЬ

Майстрыха Антаніна Юрчэня ахвотна паказвае, як яйкі пераўтвараюцца ў пісанкі

Што далей? "Зваранае яйка распісваю, кладу ў сцюдзёны настой з альховай кары і шышак, кары дуба, ржаўчыны жалеза, воцату. Праз суткі ўжо чорна-карычневыя прыгажуні. А настой цыбульніку, шалупіння ад цыбулі, афарбуе пісанкі ў чырвоны колер з рознымі адценнямі, — дзеліцца сакрэтам майстрыха. — Тады яшчэ апускаю яйка ў гарачую ваду: воск расплаўляецца, дзе ён быў — фарба не ўзялася. Тады націраю пісанкі алеем ды пакрываю бясколерным лакам, каб доўга захоўваліся".

Распісаныя сапоцкінскія яйкі называюць: маляванкі, рысаванкі, пісанкі. Прыгожыя, самабытныя. Не дзіва, што ў 2013-м мастацтва пісанак унеслі ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гістарычна-культурных каштоўнасцяў Беларусі.

У Цэнтры культуры і народнай творчасці пасёлка Сапоцкін не першы год ладзяцца выставы велікодных яек, праходзяць майстар-класы. Міні-курсы па дэкоры любяць і мясцовыя жыхары, і госці з Літвы ды Польшы. Там яшчэ можна паўдзельнічаць у абрадах, убачыць этнакалекцыю "Сялянская хата", наведаць выставу па ткацтве, пакаштаваць нацыянальныя стравы…

КРЭАТЫЎ

Вышыванкі засведчаць

На пасяджэнні Вялікай Рады беларускай суполкі ў Іркуцку ўзнікла цікавая ініцыятыва

Прайшло пасяджэнне Вялікай Рады Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Выступоўцы аналізавалі працу ІТБК, абмяркоўвалі праекты, выказвалі прапановы. Напрыклад, віталася ініцыятыва членаў суполкі: фатаграфавацца ў пашпарт ці на пасведчанне кіроўцы ў нацыянальнай беларускай кашулі-вышыванцы. Чаму ўзнікла ідэя? Бо цяпер у расійскім пашпарце нацыянальнасць грамадзяніна не пішацца, а нам хочацца сведчыць сваю беларускасць.

Вялікая Рада збіраецца раз на год, каб падвесці вынікі працы і скаардынаваць планы. Уваходзяць у склад ВР абраныя на з'ездзе члены абласной рады і старшыні аддзяленняў ІТБК. Пасля 10-га з'езду таварыства з красавіка 2013-га старшынёй абрана Алёна Сіпакова: яна і трымала справаздачу. У бюлетэні "Маланка" змешчаны і артыкул Алёны пра падзеі ІТБК ў 2013 годзе. Алёна шануе старыя напрацоўкі таварыства, развівае новыя кірункі дзейнасці. Традыцыйны абласны фестываль "Гучы, гоман Беларускі!" пройдзе 31 траўня. Ёсць і рашэнне: правесці на Байкале 5-10 жніўня Фестываль беларусаў свету.

Алег Рудакоў, г. Іркуцк

ЖЫЦЦЁВАЯ ГІСТОРЫЯ

Момант шчасця

"Не ўкрадзі" — гэта значыць і не прысвойвай чужога

Іван Ждановіч

Як у кропельцы адбіваецца ўвесь акіян, так і ў адным учынку — душа беларуская. Летась увосень жыццё падарыла мне цікавы досвед. Пачалося ўсё на Дзяды ля могілак вёскі Гулічы, непадалёк ад Клецка: мы з сябрам наведвалі магілы продкаў. Хацеў зняць пейзаж, шукаў фотаапарат — і не аказалася ў аўто ні яго, ні рукзака з фотаархівам за пяць гадоў, усімі дакументамі, пашпартам, дыктафонам, смартфонам... Ні кашалька з грашыма.

Укралі? Згубіў?.. У немалым стрэсе шмат перабралася ў галаве з падзей дня, які згасаў. Паляцелі туды, дзе былі. Гандляры адзеннем на латках у Клецку — там набываў куртку — запэўнілі: у нас як што забудуць, то знойдуць — і абавязкова вернуць. Згадалі, як цётка праз паўгорада бегла за бабуляй, якая пакінула на прылаўку бананы… Абнадзеілі, канешне, але ж мая згуба больш каштуе. Раптам спакусіцца чалавек? А можа злодзей прыгледзеў незамкнутую машыну?

Пайшлі ў міліцыю. Старшы лейтэнант Міхаіл Жданко прымаў заяву, гадзіны дзве ўсё афармляў. Казаў: у Клецку ніхто чужога не возьме, хіба з асацыяльных. Позна ўвечар ён мне пазваніў, сказаў, што ў мясцовую краму, дзе над уваходам ёсць відэакамера, я зайшоў без рукзака. Уранні Міхаіл зганяў у Нясвіж: там мы спыняліся ля гарадской ратушы: куплялі яблыкі ў "дзеда з двума зубамі". Нічога не знайшоў…

…А вось і той самы дзед, пры Нясвіжскім рынку — са скрынкай яблык, качкай і… маім рукзаком, спакаваным у новенькі цэлафанавы пакет. Пра тое, што рукзак я ў спешцы забыў ля яго на прылаўку, у шэсць раніцы паведаміла ў Мінск па тэлефоне яго жонка — маёй. "Паглядзіце, каб усё на месцы было! — хвалюецца Іван Аляксандравіч. — Я ж да цямна чакаў: мо вернецеся? Панёс дадому. Вечарам і не адкрываў. Думаў: можа гаспадар з'явіцца? А раненька глядзімо з жонкай: мо адрас які ёсць? Потым бачу: квітанцыя, плацілі за дамашні тэлефон — па ім адразу і пазванілі, жанчына падняла трубку". Ну а мая жонка і пераказала мне ў Яцкаўшчыну, дзе сустрэцца з дабрадзеем.

Згубіць ды знайсці — шчасце! Каля гандлярак з кропам, грушамі Іван Аляксандравіч выглядае дзіваком. Прапаную "купіць" у яго рукзак за дзве стотысячныя купюры — махае рукамі: многа! Дзелім суму пароўну, па-брацку. Кашалёк на месцы! Гатовы набыць у яго і качку, "што яшчэ ўчора бегала", і яблыкі оптам. "Тут кілаграм 15 — па 5 тысяч забірайце", — робіць скідку. "Значыць, з мяне сотня?" — падвышаю цану. "Ой, чалавек: лічыць ня ўмее, рукзакі губіць…" — буркае суседка. Ды спадару Лобану чужога не трэба: не, кажа цвёрда, з вас 75. А зайздрасць гандляркам! Просяць, і ў нас вазьміце што… Купляем пахкага кропу ды ідзем разам да машыны: хочацца бліжэй з добрым чалавекам пазнаёміцца.

Чаму не прысвоіў чужое? Здзіўляецца пытанню Іван Аляксандравіч: "Трэба ж па-людску жыць!". Ні я, ні вы — ніхто тут не вінаваты, з кожным такое можа здарыцца. Так разважаў нясвіжанін, калі мы спакавалі рэчы, абмяняліся тэлефонамі: трэба ж будзе калі разам і за сталом пасядзець, як наканавана было вось так сустрэцца. Іван Аляксандравіч казаў, што і бацькі яго навучалі: чужое не прысвойвай, бо карысьці ніколі не прынясе. Лепш падумай: а нехта ж згубіў, і яму вельмі шкада, як ён перажывае... Ахвота пажывіцца чужым і адпадзе — калі сябе паставіш на яго месца.

Дазволю сабе адступленне. У адным з тэкстаў знайшоў развагу: калі па-сапраўднаму любіш — то гэта заўсёды намаганне душы, скіраванае ў бок іншага. Вось і ў свяце Уваскрасення Хрыстова галоўнае слова і паняцце, сарцавіна — любоў. Не да сябе, любімага, а да бліжніх. Менавіта іх, хто побач з намі, мудрыя людзі раяць палюбіць. Зразумець. Апраўдаць і тады, калі бліжні робіць нешта не так. Дзеля чаго? "Каб не страціць святое штосьці", — адкажам радком з верша Рыгора Барадуліна.

Любіць — гэта і дараваць, і ўмець аддаваць, і нешта добрае зрабіць для іншага... Таму і кранаюць душу падобныя сітуацыі, што дапамагаюць "на ўласнай скуры" адчуць-засвоіць хрысціянскія ісціны. Дарэчы, Іван Лобан, які родам з вёскі Галаўцы, што пад Хвоева, 25 гадоў адпрацаваў вадзіцелем аўтобуса. Яго, казаў, увесь Нясвіжскі раён ведае. Па розных маршрутах ездзіў, у тым ліку і на Мінск. І ў аўтобусе знаходзіў рэчы: кашалькі, сумкі, курткі... То вадзіцелі ці ўборшчыцы аддавалі іх дыспетчару. А сам, кажа, і ў салон, бывала, стомлены дарогай, не заходзіў. Унук дабрадзея майго, Юры Карповіч, вучыцца "ў акадэміі ў Баранавічах на юрыста". Дзед і ходзіць на рынак, каб студэнту капейчыну падкінуць: вучоба платная. Думаю, учынак дзеда будзе прыкладам хлопцу па жыцці.

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Іван Лобан пры Нясвіжскім рынку

P. S. Праз тыдзень мы з жонкай былі ў камандзіроўцы ў Цюмені ды расказалі суайчыннікам пра "выпадак з рукзаком" — як прыклад таго, што такое беларуская ментальнасць. Былі апладысменты. А пасля адзін чалавек цвяроза сказаў: навошта ж прыватны выпадак абагульняць? Маўляў, вам проста пашанцавала на добрага чалавека! Ну, тады, кажам, кожны і атрымлівае ў жыцці — чаго сам варты...

А нядаўна нам стала вядома: дворнік Ігар, якога ведаюць як стараннага і безадказнага працаўніка ў сталічным Доме прэсы, аддаў на пост міліцыі знойдзены ім канверт з немалой сумай грошай. Згублены адной з журналістак. Як бачым, Іван Лобан — не адзін такі, хто чужога не прысвойвае, дапамагае іншым адчуць салодкі момант шчасця.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
E—mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1930, Заказ: 376
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2014